Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэткультуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
_______________В.Р. Языковіч
«___»_____________2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СПЕЦЫЯЛІСТА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 03 01Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка),*
*1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп’ютарная музыка),*
*1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-17 03 01-2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці,рэг.№ С17-1-62/17 вуч., С17-1-63/17 вуч., С17-1-64/17 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*І.А. Смірнова*,прафесар кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.А.Мурзіч*, мастацкі кіраўнік установы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь “Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр”»,заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь;

*Л.Л. Ражкова*, загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»,кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»(пратакол № 3 ад 24.10.2019);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»(пратакол № 2 ад 11.12.2019)

Адказны за рэдакцыю: Н. А. Мількевіч
Адказны за выпуск: І.А. Смірнова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Неабходнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста»абумоўлена тым, што ў яе рамках студэнты-першакурснікі атрымліваюць першапачатковыя веды аб сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)», сутнасці і спецыфіцы абранай імі прафесіі, а таксама неабходную інфармацыю, якая дапамагае хутчэй адаптавацца да новых умоў вучобы.

Значнасцьдадзенай вучэбнай дысцыплінывыяўляеццаў тым, штояна дазваляе студэнтам атрымаць уяўленне аб сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай адукацыі, арыентуе студэнтаў на ўсвядомленае, сур'ёзнае стаўленне да набыцця ведаў па абранай прафесіі, што ўцэлымспрыяе хутчэйшай і больш якаснай падрыхтоўцы выпускніка для работы ў галіне мастацтва эстрады.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных і прафесійных кампетэнцый:

– *акадэмічнаядзейнасць:*

АК-2.Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-4.Умець працаваць самастойна;

– *інавацыйна-метадычная дзейнасць:*

ПК-23.Выкарыстоўваць новыя інавацыйныя тэхналогіі(мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі);

– *навукова-даследчая дзейнасць:*

ПК-25.Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне тэорыі і гісторыі мастацтва эстрады.

ПК-26.Ведаць прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі і правядзення навуковых даследаванняў у сферы мастацтва эстрады.

ПК-27.Рыхтаваць даклады, матэрыялы, аналізаваць і ацэньваць сабраныя дадзеныя для навуковых даследаванняў.

ПК-28.Выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя рэсурсы.

*Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне ўяўленняў студэнтаў аб падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрам-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ках)», падрыхтоўка да ўсвядомленага і актыўнага ўдзелу ў навучальным працэсе УВА.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

– сфарміравацьпершапачатковаеўяўленнеаб прафесііўсферымастацтваэстрады;

– даць інфармацыю аб відах і кампанентах прафесійнай дзейнасці спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па напрамках спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»;

– скласці ўражаннеаб сістэме падрыхтоўкі па спецыяльнасці«Мастацтва эстрады (па напрамках)»;

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

*ведаць:*

– сучаснае становішча, гісторыю развіцця, структуру ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

– азначэнне паняццяў «эстрада», «мастацтва эстрады», «музычнае мастацтва эстрады», «кафедра мастацтва эстрады», «спецыяльнасць «мастацтва эстрады»;

– мадэль спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі і спецыфіку яго падрыхтоўкі па напрамках на кафедры мастацтва эстрады;

– асаблівасці арганізацыі вучэбнай, творчай, навуковай і самастойнай работы студэнта;

– правілы пошуку і апрацоўкі інфармацыі,неабходнай для засваення ведаў і вырашэння адукацыйных задач(вучэбная, даведачная, навуковая літаратурана папяровых і лічбавых носьбітах);

– сутнасць Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь,стратэгічныя задачы ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі;

–існуючыя спосабы абароны інфармацыі на этапах захоўвання, апрацоўкі і перадачы;

*умець:*

– рацыянальнаарганізоўвацьсамастойную работу, вучэбны і вольны час;

– эфектыўнавыкарыстоўвацьінфармацыю для актыўнага ўдзелу ў навучальным працэсе, канцэртнай і грамадскай дзейнасці;

– планавацьнабыццёдадатковайадукацыі (праз магістратуру, аспірантуру, факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў і г. д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– карыстацца вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурайна папяровых і лічбавых носьбітах;

*валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам пытанняў мастацтва эстрады;

– катэгарыяльным апаратам Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;

– метадамі збора і захоўвання інфармацыі;

– метадамі арганізацыі самастойнай вучэбнай, творчай і навуковай працы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» ўсяго адведзена 58 гадзін, з іх 34 гадзіны аўдыторныя (22гадзіны – лекцыі, 12гадзін – семінарскія) заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прызначэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста». Яе месца і роля ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)». Асноўная мэта, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Патрабаванні да заліку.

## Раздзел І. Уводзіны ў спецыяльнасць «Мастацтва эстрады (па напрамках)», напрамкі спецыяльнасці Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)», «Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)», «Мастацтва эстрады (спевы)»

### *Тэма 1.Беларускідзяржаўныўніверсітэт культурыімастацтваў – вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў галіне культуры і мастацтва*

Гісторыя ўстановы адукацыі «Беларускідзяржаўныўніверсітэткультурыімастацтваў», этапы, сучаснае становішчаі перспектывы развіцця. Арганізацыйная структура ўніверсітэта, кірункі вучэбнай, творчай, навуковай і выхаваўчай працы.

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз магістратуру, аспірантуру і дактарантуру. Саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцях «тэорыя і гісторыя культуры», «тэорыя і гісторыя мастацтва». Формы і віды дадатковай прафесійнай адукацыі. Выхаваўчая работа з моладдзю.

Грамадскіяарганізацыі: грамадскаеаб'яднанне«Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», прафкам студэнтаў,студэнцкі савет установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

### *Тэма 2.Мастацтва эстрады: асноўныя тэрміны і паняцці. Гістарычныя, сацыякультурныя перадумовы і этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў ХХ ст.*

Тэрмін і паняцце «эстрада». Вызначэнне зместу паняцця «эстрада» ў сусветнай і беларускай мастацкай культуры. Гістарычная мадыфікацыя зместу паняцця «эстрада» у беларускай мастацкай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест паняцця «мастацтва эстрады». Віды і формыпрэзентацыімастацтва эстрады ў грамадстве.

Абгрунтаванне паняцця «музычнае мастацтва эстрады».Дамінантнаяпрыкметаі дуалізм тэрміна.

Гістарычныя і сацыякультурныя перадумовы развіцця музычнага мастацтва эстрады ў Беларусі. Этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў ХХ ст.

Крыніцыіматэрыялыдлявывучэннямузычнага мастацтва эстрады.

*Тэма 3.Кафедра мастацтва эстрады БДУКМ – галоўныцэнтрпадрыхтоўкікадраўвышэйшайкваліфікацыіпа спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»:арганізацыя вучэбнай, творчай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў*

Гісторыя стварэння, сучаснае становішча і перспектывы развіцця кафедры мастацтва эстрады. Структура, кірункі вучэбнай, творчай, навуковай і выхаваўчай працы, прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры. Творчыя калектывы кафедры.

*Агульная мэта кафедры* – фарміраванне прафесійных кампетэнцый для далейшай працы выпускнікоў у выканальніцкай, педагагічнай і навуковай сферах дзейнасці.

*Прадмет дзейнасці кафедры:* навучанне і выхаванне высокакваліфікаваных спецыялістаў у вобласці эстраднага мастацтва і адукацыі; ажыццяўленне творчай і навукова-даследчай дзейнасці ў сферы эстраднага мастацтва; стварэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай выканальніцкай, музычна-педагагічнай і мастацтвазнаўчай школ у галіне музычнага мастацтва эстрады як неад'емнай часткі мастацкай культуры Рэспублікі Беларусь.

*Вучэбная работа.*Арганізацыя навучальнага працэсу па гадах і семестрах суадносна раскладу, складзенаму ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі, працоўнымі планамі і графікам адукацыйнага працэсу. Асноўныя віды навучальных заняткаў; навучальная практыка, педагагічная практыка, вытворчая практыка. Залікова-экзаменацыйныя сесіі.

*Творчая работа.* Узаемасувязь са спецыяльнымі вучэбнымідысцыплінамі і патрабаваннямі, якіяпрад'яўляюцца да прафесійных кампетэнцый студэнта. Праца ў творчых калектывах кафедры і ўніверсітэта. Канцэртная дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Навукова-даследчая работа.* Удзел у навуковых канферэнцыях, семінарах, кружках;навуковыя даследаванні пры выкананні курсавых і дыпломных прац; індывідуальная праца з навуковымі кіраўнікамі; удзел у навукова-даследчай рабоце кафедры.

*Самастойная работа.* Праца над канспектам лекцый і падрыхтоўка да семінараў з выкарыстаннем метадычных, інфармацыйных і навукова-даследчых матэрыялаў. Метадыпошукуінабыццяінфармацыі ва ўстанове вышэйшай адукацыі. Сайты Internet.

Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў, работа над музычнымі творамі і падрыхтоўка да індывідуальных заняткаў па спецдысцыплінах, да конкурсаў і канцэртаў.

### *Тэма 4. Мадэль спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»*

Спецыяльнасць «Мастацтва эстрады (па напрамках)» як сукупнасць тэарэтычных і практычных ведаў па асобнай галіне музычнага мастацтва і адукацыі.

«Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі» – галоўны заканадаўчы акт у сферы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Законы па пытаннях адукацыі ў вышэйшай школе.

Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі першай ступені ОСВО1-17 03 01-2013, спецыяльнасць 17 03 01 «Мастацтва эстрады (па напрамках)» – галоўны дакумент, які ўстанаўлівае мэты і задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста, патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка ўстановы вышэйшай адукацыі, зместу адукацыйнай праграмы і яе рэалізацыі; забеспячэння адукацыйнага працэсу і выніковай дзяржаўнай атэстацыі выпускніка.

Тыпавы вучэбны план як асноўны дакумент, які вызначае змест і рэжым падрыхтоўкі студэнта да выніковай дзяржаўнай атэстацыі.

Вучэбныя планы спецыяльнасці «Мастацтва эстрады(панапрамках)».Групы вучэбных дысцыплін, іхпрызначэннеіўзаемасувязь.

Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста. Аб'екты прафесійнай дзейнасці. Віды і задачы прафесійнай дзейнасці. Кваліфікацыйная характарыстыка і склад кампетэнцый спецыяліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палажэнне аб спецыяльным фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы таленавітых студэнтаў.

Праграма «Маладыя таленты Беларусі».

## Раздзел II. Інфармацыйная культура спецыяліста

### *Тэма 5.Арганізацыя інфармацыйнай дзейнасці студэнтаў*

Інфармацыя як сукупнасць даных, захаваных і распаўсюджаных у часе і прасторы на матэрыяльным носьбіце.

Інфармацыйная дзейнасць студэнта – збор, апрацоўка, захоўванне, пошук, распаўсюджанне інфармацыі, фарміраванне інфармацыйнага рэсурсу.

*Віды інфармацыі:* візуальная (зрокавая), аўдыяльная (гукавая), аўдыёвізуальная (зрокава-гукавая).

*Электронная інфармацыя.* Сродкі абароны электроннай інфармацыі. Існуючыя спосабы абароны інфармацыі на этапах захоўвання, апрацоўкі і перадачы.

*Інфармацыя навуковага характару:* манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялы навуковых канферэнцый, даведнікі і інш. Інфармацыя метадычнага характару (падручнікі, дыдактычныя дапаможнікі, тыпавыя і вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы па дысцыплінах і інш.).

*Інфармацыйна-аналітычныяматэрыялы*: аўдыё- і відэазапісы канцэртаў, майстар-класаў, урокаў і інш.

### *Тэма 6. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь*

Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі як сістэма афіцыйных поглядаў на нацыянальную бяспеку Рэспублікі Беларусь у інфармацыйнай сферы. Сутнасць, змест, тэрміналогія Канцэпцыі.

Дзяржаўныя прыярытэты і стратэгічныя задачы ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Бяспека масавай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Дзяржаўнае рэагаванне на рызыкі, выклікі і пагрозы ў інфармацыйнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторныхгадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семі-нары | КСР | |
| **Уводзіны** | 1 | | | |
| **Раздзел І. Уводзіны ў спецыяльнасць «Мастацтва эстрады (па напрамках)», напрамкі спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)», «Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)», «Мастацтва эстрады (спевы)»** | | | | |
| *Тэма 1.*Беларускідзяржаўныўніверсітэткультурыімастацтваў – вядучая ўстанова вышэйшай адукацыі ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры і мастацтва | 1 | 2 | 1 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 2.* Мастацтва эстрады: асноўныя тэрміны і паняцці.Гістарычныя, сацыякультурныя перадумовы і этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў ХХ ст. | 2 | 4 | 2 | кантрольная работа |
| *Тэма 3.*Кафедра мастацтва эстрады БДУКМ – галоўныцэнтрпадрыхтоўкікадраўвышэйшайкваліфікацыіпа спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»: арганізацыя вучэбнай, творчай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў | 2 | 2 | 1 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма 4.*Мадэль спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)» | 2 | 4 | 1 | пісьмовае апытанне |
| **Раздзел ІІ.Інфармацыйная культура спецыяліста** | | | | |
| *Тэма 5.*Арганізацыя інфармацыйнай дзейнасці студэнтаў | 2 | 2 | 1 | пісьмовае апытанне |
| *Тэма6.*Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | | |
| **Усяго…** | **12** | **16** | **6** | **залік** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Аб інфарматызацыі : Закон Рэсп. Беларусь, 6 верас. 1995 г. // Ведамасці Вярхоўн. СаветаРэсп. Беларусь. – 1995. – №33. – Арт. 428. – С. 3–16.

*2.* Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь :Закон Рэсп. Беларусь, 18 мая 2004 г. // Нац. реестр правовых актовРесп. Беларусь. – 2004. – № 87. – С. 7–22.

*3.*Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск :Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2011. – 398 с.

*4. Кузьмініч, Т.В.* Інфармацыйная культура асобы : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч.– Мінск, 2002. – С. 37–101.

*5.* О Концепции информационной безопасности Республики Беларусь :Постановление Совета Безопасности Рэсп. Беларусь от 18.03.2019 г. № 1 [Электронный ресурс] // Официальный Интернет-портал ПрезидентаРесп. Беларусь.– Режим доступа:http://president.gov.by/uploads/documents/2019/1postpdf. – Дата доступа: 20.06.2019.

*6. Смирнова, И.А.*Искусство эстрады как разновидность театрально-сценического искусства / И. А. Смирнова // Традыцыйная і сучасная культура Беларусі: гісторыя, актуальны стан, перспектывы : матэрыялы навуковай канф., Мінск, 6 снежня 2012 г. / Беларус. дзярж.ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 231–237.

*7. Смирнова, И.А.*Образовательный стандарт Республики Беларусь высшего образования первой ступени по специальности *1-17 03 01* «Искусство эстрады» ОРСБ 1-17 03 01-2008 / И. А. Смирнова (рук.), Н. Л. Кузьминич(исполн.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2008. – 39 с.

*8. Смирнова, И.А.* Интеграционные связи в подготовке специалистов высшей квалификации /И. А. Смирнова // Культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навуковай канф., 25–26 лістап.2009 г. / рэд.савет: Б. У. Святлоў (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С.115–122.

*9. Смирнова, И.А.* Музыкальная эстрада Беларуси: обстоятельстваразвития / И. А. Смирнова // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. навук. арт. Вып. 9 / Ін-т

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі / навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2010. – С. 186–191.

*10. Смирнова, И.А.* Музыкальное искусство эстрады: обоснование понятия / И. А. Смирнова// Культура: открытый формат :сб.науч. статей /БГУКИ. – Минск, 2014. – С. 230–233.

*11. Смирнова, И.А.* Специальность «Искусство эстрады» в системе профессионального музыкального образования Республики Беларусь / И. А. Смирнова // Культура. Наука. Творчество : VI Междунар. науч-практ. конф., Минск, 10–11 мая 2012 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск, 2012.– С. 80–84.

*12. Смирнова, И.А.* Эстрада : энциклопедия : в 7 т. /И. А. Смирнова. – Минск, 2008. – Т .7.– С.678–680.

*13.* Энцыклапедыябеларускайпапулярнаймузыкі/ склад. Дз. Падбярэзскі[і інш.]. – Мінск : Зміцер Колас, 2008.– 368 с.

*Дадатковая*

*1. Ландэ, Д.В.* Поиск знаний в Internet. Профессиональная работа / Д. В. Ландэ. – М. : Вильямс, 2005. – 272 с.

*2.* Массовая культура : учеб. пособие / К. З. Акопян [и др.]. – М. : Альфа-М : ИНФРА-М, 2004. – 303 с.

*3. Утесов, Л. О.* Спасибо, сердце! / Л. Утесов. – М. : Вигрус, 2000. – 363 с.

*4.* Эстрада в России. XX век. Лексикон/ М-во культуры Рос. Федерации, Гос. ин-т искусствознания ; рук. проекта и отв. ред. Е. Д. Уварова. – М. :РОССПЭН, 2000. – 784 с.

*5. Эхо, Ю.*Письменные работы в вузах /Ю. Эхо. – 3-е изд. – М. : ИНФРА-М, 2002. – 127 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы, рэкамендаваныя для вывучэння

1. Принципы исторической репрезентации белорусского музыкального эстрадного искусства в художественной культуре Беларуси ХХ века : науч.-метод. пособие / сост. И. А. Смирнова[и др.]. – Минск :БГУКИ, 2013. – 154 с.

2. Музыкальная энциклопедия «Музыкальное искусство эстрады Беларуси. ХХ век»[Электронный ресурс] / сост. И. А. Смирнова [и др.]. – Минск :БГУКИ, 2013. – 1 электрон.опт. диск (DVD-ROM).

3. Терминологический словарь «Музыкальное искусство эстрады Беларуси. ХХ век» [Электронный ресурс] / сост. И. А. Смирнова[и др.]. – Минск : БГУКИ, 2013. – 1 электрон. опт.диск (DVD-ROM).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады выкладання вучэбнай дысцыпліны

Выкладанне дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» здзяйсняецца з выкарыстаннем розных метадаў навучання:

–пасіўны (форма ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам, пры якой выкладчык чытае лекцыйны матэрыял, а студэнт яго слухае і запісвае, але галоўная роля адводзіцца менавіта выкладчыку);

– актыўны (форма ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам праз дыялог і дыскусіі ў працэсе засваення лекцыйнага матэрыялу);

– інтэрактыўны (арыентацыя на шырокае ўзаемадзеянне студэнтаў не толькі з выкладчыкам, але і друг з другам, на дамінаванне актыўнасці навучэнцаў у працэсе практычных заняткаў);

– метады кантролю за эфектыўнасцю навучальна-пазнавальнай дзейнасці: вусныя, пісьмовыя праверкі і самаправеркі выніковасці авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае працу над канспектам лекцый і падрыхтоўку да семінараў з выкарыстаннем метадычных, інфармацыйных і навукова-даследчых матэрыялаў.

**Рэкамендаваныясродкiдыягностыкi**

Длякантролюiсамакантролюведаўстудэнтаўвыкары-стоўваеццадыягнастычныiнструментарый, якi маерознаўзроў-невыхарактарiўжываецца комплексна:

– заданнi, якiя прадугледжваюць самастойную работу з iнфармацыйнай, вучэбна-метадычнай i навуковай лiтаратурай;

– праверачныя кантрольныя работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**
**І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СПЕЦЫЯЛІСТА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка),*
*1-17 03 01-02 Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка),*
*1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

Рэдактар Н. А. Мількевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,52. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ